Ініцыятыва UN75 у дзеянні

У 2020 годзе ААН адзначае сваё 75-годдзе. Генеральны сакратар ААН Антоніа Гутэрыш ініцыіраваў найбуйнейшую ў гісторыі арганізацыі кампанію глабальных дэбатаў "75 гадоў ААН: 2020 год і наступны перыяд — у будучыню разам". У нашай краіне гэта кампанія атрымала статус моладзёжнай і, мяркуючы па колькасці ўдзельнікаў, стала сапраўды маштабнай.

Рэспубліка Беларусь далучылася да гэтай міжнароднай кампаніі, пацвердзіўшы на самым высокім узроўні сваю прыхільнасць канцэпцыі ўстойлівага развіцця і гатоўнасць унесці свой уклад у святкаванне гадавіны стварэння ААН. Маладзёжная кампанія "Насустрач будучыні, якую мы хочам" была ініцыіравана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Прадстаўніцтвам ААН у Рэспубліцы Беларусь. Арганізатарамі дыскусій выступілі Офіс Пастаяннага каардынатара ААН у Рэспубліцы Беларусь, агенцтва ААН, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, Асацыяцыя "Адукацыя для ўстойлівага развіцця", рэгіянальныя УВА — члены кластара бесперапыннай педагагічнай адукацыі. Комплексную падтрымку мерапрыемствам кампаніі "Насустрач будучыні, якую мы хочам" аказвае каардынацыйны цэнтр "Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця" БДПУ імя Максіма Танка.

Самым простым спосабам падтрымаць ініцыятыву UN75 з'яўляецца ўдзел у анлайн-апытанні "Скажы сваё слова. Вам вырашаць, якой будзе наша будучыня". Яго можна знайсці на вэб-сайце ААН — *www.un.org*. Мэта апытання — сабраць меркаванні як мага большай колькасці жыхароў планеты аб тым, як трэба вырашаць праблемы, якія стаяць перад чалавецтвам. Прамежкавыя вынікі гэтага сацыялагічнага даследавання паказваюць, што, на думку грамадзян, якія ўжо прынялі ўдзел у кампаніі ААН, гарантыяй шчаслівага заўтра з'яўляюцца абарона правоў чалавека, вырашэнне канфліктаў, забеспячэнне роўнага доступу да базавых паслуг, уключаючы адукацыю і ахову здароўя, выкараненне дыскрымінацыі. Калі вы яшчэ не прымалі ўдзел у такой глабальнай акцыі, знайдзіце пяць мінут свайго вольнага часу, каб зайсці на сайт *www.un75.org* і задумацца пра тое, якім бы вы хацелі бачыць свой горад, універсітэт або школу, сваю краіну, увесь свет праз 5, 10, 50 гадоў. Меркаванні і ідэі ўдзельнікаў апытання будуць прадстаўлены сусветным лідарам і высокапастаўленым службовым асобам ААН на 75-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у верасні 2020 года.

Ключавым мерапрыемствам маладзёжнай кампаніі сталі адкрытыя анлайн-дыскусіі "Будучыня, якую мы хочам: нашы ідэі і дзеянні", якія прайшлі ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны ў красавіку — маі 2020 года. Удзельнікамі дыскусій сталі навучэнцы педагагічных класаў, студэнты і педагагічныя работнікі розных устаноў адукацыі нашай краіны, маладзёжныя паслы Мэт устойлівага развіцця (МУР). Тэматыка рэгіянальных дыскусій ахоплівала розныя аспекты дзейнасці агенцтваў ААН у Рэспубліцы Беларусь, актуальныя праблемы рэгіёна і магчымасць уключэння моладзі ў іх вырашэнне. Ганаровым госцем амаль усіх дыскусій была Іаана Казана-Вішнявецкі, Пастаянны каардынатар ААН у Рэспубліцы Беларусь.

Марафон дыскусій стартаваў 24 красавіка, у гэты дзень больш за 100 навучэнцаў і студэнтаў, настаўнікаў і выкладчыкаў устаноў адукацыі Палескага рэгіёна сабраліся анлайн, каб разам з экспертамі і прадстаўнікамі ПРААН у Рэспубліцы Беларусь абмеркаваць магчымасці ўключэння маладых людзей у працэсы вырашэння праблем, звязаных з адаптацыяй да змен клімату. Мадэраваў дыскусію Аляксей Чыстадарскі, супрацоўнік аддзела інфармацыі і піяру Прадстаўніцтва ПРААН у Беларусі. Падчас дыскусіі прагучалі прапановы па стварэнні турыстычнага кластара Прыпяцкага Палесся, які дапаможа распрацаваць сетку экалагічных маршрутаў і стварыць вакол іх сэрвісную інфраструктуру; выкарыстанні інавацый і лічбавых тэхналогій для папярэджання тэхнагенных, прыродных і медыцынскіх крызісаў; арганізацыі на базе Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта бізнес-акселератара па стымуляванні мясцовага малога і сярэдняга бізнесу. Асаблівую цікавасць выклікаў праект па развядзенні сталовых гатункаў вінаграду і развіцці на Палессі беларускай індустрыі вінаробства.

Эстафету рэгіянальных дыскусій у Брэсцкай вобласці прыняў Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт. 5 мая ў фармаце відэаканферэнцыі прайшла адкрытая рэгіянальная дыскусія па тэме "Аднаўленчае правасуддзе для дзяцей і падлеткаў у канфлікце з законам", удзельнікамі якой сталі больш за 80 навучэнцаў і студэнтаў розных навучальных устаноў Брэсцкага рэгіёна. Павіталі ўдзельнікаў сустрэчы Віктар Радзівіноўскі, дарадчык па камунікацыі офіса Пастаяннага каардынатара ААН у Рэспубліцы Беларусь, і Габрыэла Акімава, намеснік Прадстаўніка Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Рэспубліцы Беларусь. Ключавымі пытаннямі дыскусіі сталі праблемы дзяцей, якія знаходзяцца ў канфлікце з законам, і абарона іх правоў. Асаблівая ўвага ў ходзе дыскусіі была ўдзелена ідэі аднаўленчага правасуддзя і мэтазгоднасці ўвядзення працэдуры медыяцыі ў крымінальны працэс па справах, звязаных з дзецьмі, а таксама прымянення да непаўналетніх пакаранняў, не звязаных з пазбаўленнем волі.

На працягу некалькіх гадоў ЮНІСЕФ прыцягвае да сумеснай дзейнасці ў гэтым напрамку ўстановы адукацыі і сацыяльныя службы Брэсцкага рэгіёна. Падчас дыскусіі былі прадстаўлены сумесна рэалізаваныя праекты, напрыклад, распрацоўка мабільнага дадатку Justice, да апрабацыі якога былі запрошаны ўдзельнікі сустрэчы.

18 мая ў рамках маладзёжнай кампаніі прайшла адкрытая рэгіянальная дыскусія "Гандаль людзьмі і міграцыя — актыўны падыход моладзі". Гэтым разам удзел у дыскусіі прынялі прадстаўнікі больш як 70 устаноў адукацыі Мінскай вобласці. Да ўдзельнікаў дыскусіі звярнуліся Іаана Казана-Вішнявецкі, Пастаянны каардынатар ААН у Рэспубліцы Беларусь, і Махым Аразмухамедава, кіраўнік Прадстаўніцтва Міжнароднай арганізацыі па міграцыі (МАМ). Падчас дыскусіі абмяркоўваліся праблемы бяспечнай міграцыі і папярэджання гандлю людзьмі, напрамкі дзейнасці МАМ у Рэспубліцы Беларусь, перспектывы ўключэння моладзі ў рэалізацыю сумесных тэматычных праектаў. Каманда МАМ прадставіла летні маладзёжны лагер "Вывучай. Дзейнічай. Падзяліся" і рэалізаваныя ў рамках лагера праекты. Інфармацыю аб змене лагера ў 2020 годзе можна атрымаць, далучыўшыся да груп МАМ у сацыяльных сетках Facebook і Instagram.

Да Сусветнага дня памяці людзей, якія памерлі ад СНІДу, было прымеркавана правядзенне адкрытай рэгіянальнай дыскусіі "Сацыяльныя эпідэміі XXI стагоддзя", арганізаванай з падтрымкай Гомельскага абласнога інстытута развіцця адукацыі і Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф.Скарыны. Адкрываючы дыскусію, Іаана Казана-Вішнявецкі звярнула ўвагу ўдзельнікаў сустрэчы на ролю ААН у міжнародным супрацоўніцтве і вырашэнні праблем, звязаных са здароўем людзей, падкрэсліўшы, што дасягненне МУР 3 (здароўе і дабрабыт) наўпрост спалучана з МУР 4 (якасная адукацыя), МУР 5 (гендарная роўнасць) і МУР 10 (памяншэнне няроўнасці), таму гэта справа комплексная і "тычыцца яна нават тых, каго не тычыцца". Пацвярджэннем таго, што словы Пастаяннага каардынатара ААН у Рэспубліцы Беларусь зацікавілі ўдзельнікаў дыскусіі, стала велізарная колькасць пытанняў у чаце Zoom, на якія яна з цікавасцю адказала. Асноўнай тэмай дыскусіі стала дзейнасць Праграмы ААН па ВІЧ / СНІДзе (UNAIDS) па прафілактыцы і супрацьдзеянні ВІЧ-інфекцыі ў нашай краіне.

Асаблівую цікавасць выклікала інфармацыя пра кампанію "Стратэгія 90—90—90", да якой Беларусь далучылася ў 2015 годзе. Мэта кампаніі заключаецца ў тым, каб 90% людзей, якія жывуць з ВІЧ, ведалі пра свой статус; 90% людзей, якія ведаюць свой статус, атрымлівалі лячэнне; і 90% людзей, якія атрымліваюць лячэнне, мелі невызначальную вірусную нагрузку. Гасцямі адкрытай рэгіянальнай дыскусіі сталі прадстаўнікі грамадскай арганізацыі "Людзі +", якая аб'ядноўвае беларусаў са станоўчым ВІЧ-статусам. На прыкладах рэальных гісторый яны актуалізавалі праблему стыгматызацыі і дыскрымінацыі ў сучасным беларускім грамадстве. Да іх аповеду далучылася Пасол добрай волі UNAIDS Святлана Бароўская, якая прадставіла ўдзельнікам дыскусіі экспрэс-тэсты на ВІЧ і прадэманстравала, як за 20 мінут можна правесці самадыягностыку.

20 мая эстафету адкрытых рэгіянальных дыскусій прыняў Віцебскі рэгіён. Больш за 60 устаноў адукацыі вобласці сталі ўдзельнікамі дыскусіі "Бежанцы і асобы без грамадзянства ў кантэксце МУР", арганізаванай пры падтрымцы Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М.Машэрава і Віцебскага абласнога інстытута развіцця адукацыі. Супрацоўнікі УВКБ ААН у Рэспубліцы Беларусь на чале з Жанам-Івам Бушардзі прадставілі асноўныя напрамкі дзейнасці агенцтва: абарона і дапамога бежанцам, скарачэнне колькасці асоб без грамадзянства, умацаванне партнёрскіх сувязей, прадухіленне сексуальнага і гендарнага гвалту. Зваротная сувязь з удзельнікамі дыскусіі была наладжана не толькі пры дапамозе чата, дзе ў фармаце свабоднага мікрафона можна было задаць пытанні і падзяліцца каментарыямі, але і ў форме інтэрактыўнага апытання аб дзейнасці УВКБ, створанага ў дадатку для мабільных тэлефонаў Kahoot.

Віртуальная сустрэча на Гродзеншчыне адбылася 21 мая. Да дыскусіі, прысвечанай праблеме гендарнай роўнасці ў сучасным грамадстве, далучыліся больш за 80 навучэнцаў і студэнтаў з 62 устаноў адукацыі Гродзенскай вобласці. Вольга Лукашкова, каардынатар праграмнай дзейнасці Фонду ААН у галіне народанасельніцтва ў Беларусі, прадставіла дзейнасць арганізацый Y-Peer Belarus і YWCA Belarus, якія папулярызуюць розныя формы работы з моладдзю: дэбаты, трэнінгі па тэмах канфлікт-менеджменту, сексуальнага і рэпрадуктыўнага здароўя, гендарнай роўнасці, майстар-класы па аратарскім майстэрстве, форум-тэатры і квіз па Мэтах устойлівага развіцця. Вольга Янчук, Генеральны сакратар YWCA Belarus, растлумачыла розніцу паміж паняццямі "пол" і "гендар" і прапанавала абмеркаваць найбольш актуальныя для сучаснага беларускага грамадства гендарныя стэрэатыпы.

Пытаннямі здаровага ладу жыцця, прафілактыкі захворванняў і іх лячэння, захавання здароўя на працягу ўсяго жыцця была прысвечана адкрытая рэгіянальная дыскусія "Здароўе чалавека: асабістая адказнасць і глабальная праблема", якая адбылася ў анлайн-рэжыме 25 мая. У дыскусіі прынялі ўдзел студэнты мінскіх універсітэтаў, навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі Мінска з профільнымі класамі педагагічнай накіраванасці, маладзёжныя паслы МУР.

У сваім звароце да ўдзельнікаў дыскусіі Батыр Бердыклычаў, афіцыйны прадстаўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Рэспубліцы Беларусь (СААЗ), ахарактарызаваў спецыфіку дзейнасці іх арганізацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Вячаслаў Гранько, каардынатар праграм па інфекцыйных захворваннях Краінавага офіса СААЗ у Беларусі, прадставіў рэгіянальныя праекты, рэалізаваныя ў Рэспубліцы Беларусь пры ўдзеле СААЗ, уключаючы супрацьдзеянне COVID-19. Пытанням прафілактыкі захворванняў і ўмацавання здароўя на працягу ўсяго жыцця ўдзяліў увагу ў сваім звароце да ўдзельнікаў дыскусіі Валянцін Русовіч, каардынатар праграм Краінавага офіса СААЗ у Беларусі. Асаблівую цікавасць мінскіх школьнікаў і студэнтаў выклікаў прадстаўлены ім вопыт Ісландыі, дзе вядзецца актыўная работа па папулярызацыі здаровага ладу жыцця сярод дзяцей і моладзі.

Адзін з блокаў дыскусіі быў прысвечаны павышэнню ролі моладзі ў сучасным грамадстве і знаёмству з маладзёжнымі праектамі, якія былі рэалізаваны ва ўстановах адукацыі Мінска падчас пандэміі. Свае ініцыятывы і сацыяльна значныя акцыі прадставілі студэнты БДПУ, БНТУ, БДУКМ. Прадстаўнікі гімназіі № 19 Мінска, рэсурснага цэнтра Асацыяцыі "Адукацыя для ўстойлівага развіцця", расказалі пра праект "Гімназія бяспекі", эстафету здароўя #dontworrybehealthy, дабрачынную акцыю "Клопат побач". Навучэнцы Мінскага гарадскога педагагічнага каледжа прапанавалі далучыцца да праекта "Мой стыль жыцця сёння — маё здароўе і поспех заўтра". Вучні сярэдняй школы № 203 Мінска, таксама члена Асацыяцыі "Адукацыя для ўстойлівага развіцця", прадэманстравалі відэаролік пра іх удзел у акцыі "Час дапамагаць", у выніку якой больш за 1000 масак былі перададзены медыцынскім работнікам паліклінікі № 28 Мінска.

Аб удзеле ў акцыі #Дзякуймедыкам, арганізатарамі якой выступіў БРСМ пры падтрымцы Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства "Белпошта", расказалі навучэнцы шэрага мінскіх школ.

Фінальная анлайн-сесія адкрытых рэгіянальных дыскусій у рамках маладзёжнай кампаніі "Насустрач будучыні, якую мы хочам" была прысвечана абмеркаванню магчымасцей для развіцця прафесійных кампетэнцый і працаўладкавання моладзі. Сустрэча адбылася 29 мая і ўдзел у ёй прынялі больш за 70 педагогаў і студэнтаў Магілёўскай вобласці. Ад імя сістэмы адукацыі Магілёўшчыны ўдзельнікаў сустрэчы павітаў рэктар МДУ Дзяніс Уладзіміравіч Дук. Аляксандра Яўгенаўна Салаўёва, Пастаянны прадстаўнік ПРААН у Беларусі, адзначыла неабходнасць забеспячэння эканомікі кваліфікаванымі спецыялістамі і падкрэсліла важнасць аб'яднання намаганняў школ і ўніверсітэтаў са спецыяльна створанымі ў Магілёўскай вобласці структурамі, якія аказваюць падтрымку як маладзёжнаму стартап-руху, так і розным адукацыйным курсам і праграмам у галіне прадпрымальніцтва (бізнес-інкубатар Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, тэхнапаркі і інш.).

Наталля Уладзіміраўна Макоўская, прарэктар МДУ, падзялілася вопытам і напрацоўкамі ўніверсітэта па павышэнні прафесійных кампетэнцый студэнтаў і выказалася пра неабходнасць больш цеснага супрацоўніцтва з іншымі ўстановамі сістэмы адукацыі, цэнтрамі інавацый і падтрымкі прадпрымальніцтва, прыватным бізнесам і агенцтвамі сістэмы ААН у Беларусі. У развіцці гэтай тэмы прадстаўнікі МДУ прапанавалі разгледзець магчымасць стварэння кар'ернага цэнтра для студэнтаў. На думку Наталлі Уладзіміраўны, такія пляцоўкі маглі б аб'яднаць студэнтаў і патэнцыяльных работадаўцаў, спрыялі б большай інфармаванасці пра новыя тэндэнцыі, патрабаванні і магчымасці на сучасным дынамічным рынку працы.

Магілёўская вобласць — першы рэгіён краіны, дзе ў цяперашні час адбываецца распрацоўка афіцыйнай Стратэгіі ўстойлівага развіцця (СУР), таму працягам сустрэчы стала абмеркаванне ключавых кампетэнцый чалавека ў галіне ўстойлівага развіцця — умовы канструктыўнага і адказнага ўдзелу грамадзян у працэсах развіцця краін і рэгіёнаў. Спецыфіка міжнароднага погляду на гэтую пазіцыю і перспектыўныя сферы прыкладання дзіцяча-дарослай і маладзёжнай актыўнасці, якія дазваляюць удзельнікам сумесных ініцыятыў набываць якасці і кампетэнцыі, неабходныя для забеспячэння і ўласнага, і рэгіянальнага дабрабыту, былі акрэслены ў прэзентацыях супрацоўнікаў каардынацыйнага цэнтра "Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця" БДПУ імя Максіма Танка Кацярыны Уладзіміраўны Спосаб і Соф'і Барысаўны Савелавай.

Сістэму дзейнасці па адукацыйным суправаджэнні СУР-2035 Магілёўскай вобласці прадставіла Наталля Рыгораўна Афанасьева, начальнік цэнтра ідэалагічнай, выхаваўчай работы і педагагічных інавацый МДАІРА, а Антаніна Іванаўна Максімава, дырэктар Касцюковіцкай гімназіі, на канкрэтных прыкладах прадэманстравала механізмы і інструменты арганізацыі сістэмы стымулявання і падтрымкі ўстановай адукацыі розных працэсаў развіцця мясцовай супольнасці, у якіх паспяхова адбываецца фарміраванне і асобасных, і прафесійных кампетэнцый вучняў, педагогаў і моладзі раёна.

Мадэратар дыскусіі Аляксей Чыстадарскі, супрацоўнік аддзела інфармацыі Прадстаўніцтва ПРААН у Беларусі, выказаў надзею, што ўсе прапановы і ідэі, агучаныя падчас анлайн-сустрэчы, стануць штуршком для развіцця новых фарматаў партнёрства па падтрымцы эканамічнага патэнцыялу моладзі не толькі Магілёўскага рэгіёна, але і ўсёй краіны.

У ходзе рэгіянальных дыскусій таксама абмяркоўвалася магчымасць удзелу школьнікаў і студэнтаў у серыі маладзёжных акцый і ініцыятыў "Нікога не пакінем убаку", мэтай якіх з'яўляецца стымуляванне маладзёжнай актыўнасці па папулярызацыі каштоўнасцей і Мэт устойлівага развіцця сярод розных груп насельніцтва, развіццё добраахвотніцкай дзейнасці, прапаганда пазітыўнага ладу жыцця і актыўнай жыццёвай пазіцыі.

Маладзёжныя акцыі і ініцыятывы могуць закранаць праблематыку, найбольш актуальную для Рэспублікі Беларусь з пункту гледжання Стратэгіі развіцця маладзёжнай палітыкі на перыяд да 2030 года і акселератара "Арыентацыя на будучыя пакаленні" Дарожнай карты па дасягненні Мэт устойлівага развіцця ў Рэспубліцы Беларусь, напрыклад:

— падтрымка дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя, бяздомных;

— развіццё маладзёжных сродкаў масавай інфармацыі, падтрымка маладых журналістаў, блогераў;

— папулярызацыя здаровага ладу жыцця, развіццё фізічнай культуры і спорту ў дзіцячым і студэнцкім асяроддзі;

— патрыятычнае выхаванне моладзі, развіццё культуры памяці;

— прафілактыка наркаманіі, алкагалізму, таксікаманіі і курэння;

— развіццё інавацыйнай дзейнасці, робататэхнікі, навукова-тэхнічнай творчасці, вынаходніцтва і канструявання;

— прафілактыка правапарушэнняў і злачынстваў сярод дзяцей і моладзі, падтрымка маладых людзей, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, у тым ліку ў канфлікце з законам;

— развіццё міжнацыянальных адносін, міжнароднага і міжрэгіянальнага маладзёжнага супрацоўніцтва і інш.

Інеса ЗУБРЫЛІНА,
начальнік каардынацыйнага цэнтра "Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця" БДПУ імя Максіма Танка.